# ПАЎЗУНЫ (РЭПТЫЛІІ)

**?** **Успомніце** вядомых вам паўзуноў. Што вы пра іх хочаце даведацца? с. 77

Большасць **паўзуноў**, або **рэптылій**, жыве ў цёплых і гарачых краінах. Але некаторыя жывуць і ў нас. Яны актыўныя ў цёплую пару года, а да зімы ўпадаюць у спячку. Перамяшчаючыся па сушы, многія паўзуны дакранаюцца да паверхні зямлі сваім целам. Жывёлы як бы змыкаюцца з ёй, таму і атрымалі такую назву.

**?** **Разгледзьце** малюнкі. **Прачытайце** назвы адлюстраваных паўзуноў. **Знайдзіце** жывёлу гэтай групы на форзацы 2.



*Яшчарка спрытная*



*Чарапаха балотная*

**Паразважайце**, што агульнага ў паўзуноў. Чаму іх аб'ядналі ў адну групу? **Параўнайце** адказ з тэкстам.

Цела паўзуноў пакрыта сухой скурай з рагавымі лускавінкамі. У чарапах лускавінкі зрасліся і ўтварылі панцыр. Цвёрдае рагавое пакрыццё абараняе рэптылій на сушы ад пашкоджванняў і высыхання. Дыхаюць гэтыя жывёлы з дапамогай лёгкіх. Размнажаюцца паўзуны толькі на сушы. З адкладзеных яек у іх з'яўляюцца маладыя жывёлы, падобныя да дарослых.





Вуж



Гадзюка



Правообладатель Академия образования

**Абмяркуйце**, чым харчуюцца яшчаркі, змеі і чарапахі. Як яны ядуць сваю здабычу?

Яшчаркі і змеі — **драпежныя жывёлы**. Здабычу яны заглытваюць цалкам. Яшчаркі ядуць насякомых, іх лічынак, дажджавых чарвякоў, смаўжоў. Змеі палююць на жаб, яшчарак, насякомых, мышэй, дробных птушак.


Мядзянка

Гадзюкі перад тым, як праглынуць здабычу, забіваюць яе ядам. А мядзянкі душаць яе кольцамі свайго цела.

Чарапаха балотная — **усёедная жывёла**. Яна корміцца рыбай, жабянятамі, малюскамі, чарвякамі, насякомымі, воднымі раслінамі. Ежу есць, шчодра запіваючы вадой кожны кавалачак.

**Паразважайце**, якая роля паўзуноў у прыродзе.

У прыродзе паўзуны іграюць важную ролю. Яшчаркі і змеі знішчаюць насякомых і дробных грызуноў. Самі паўзуны

служаць ежай іншым жывёлам. Змей і яшчарак ловяць чаплі, буслы, арлы. На змей палююць барсукі, вожыкі, гарнастаі.



## Праверце сябе

1. Якіх паўзуноў вы ведаеце? Чаму іх называюць паўзунамі?
2. Чым паўзуны адрозніваюцца ад жывёл іншых груп?
3. Што новага вы даведаліся пра харчаванне паўзуноў?

## Пытанні юным знаўцам

*1. Успомніце, куды на зіму хаваюцца змеі і яшчаркі. Хто зімуе па адным, хто збіраецца групамі?

*2. Чым паўзуны падобны да земнаводных? Чым адрозніваюцца ад іх?

С. 146—153. Чым людзей здзіўляюць змеі?

Н. И. Сладков «Рептилии»; Г. В. Трафимова «Зачем крокодил камни глотает?».



Правообладатель Академия образования